Пралетарыі усіх краін, яднайцеся!

# Беларускі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 24 (753) ● Панядзелак, 1 верасня 1969 г. Цана 2 кап. Год выдання XXII

## ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

**Мы пачынаем новы навучальны год у час усенароднай дзейснай падрыхтоўкі да выдатнай падзеі ў гісторыі чалавецтва — 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.**

**Універсітэцкая моладзь, верная сваім цудоўным традыцыям, паспела ўжо адзначыць ленінскі год поспехамі ў вучобе, значнымі перамогамі ў навукова-даследчай рабоце, выдатнымі працоўнымі справамі на будоўлях рэспублікі і Саюза, высокімі дасягненнямі ў мастацкай самадзейнасці і спорце.**

**Аднак падлік поспехаў не павінен нас супакойваць. Паўсядзённыя важнейшыя задачы, якія мы вырашаем, патрабуюць новых сіл, творчай вынаходлівасці, працавітасці і найвялікшага добрасумлення. Асноўная з гэтых задач — падрыхтоўка сапраўды перадавых спецыялістаў, носьбітаў высокай культуры. Такіх спецыялістаў чакае Радзіма, такімі яны павінны расці ў нашым універсітэце, які носіць імя вялікага Леніна.**

**За работу, сябры! Поспехаў вам і невычэрпнай энергіі, энтузіязму і настойлівасці ў дасягненні мэты.**

**РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, МЯСЦКОМ, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА, ПРАФКОМ.**

## ВЕРНАСЦЬ ТРАДЫЦЫЯМ

На долю сучаснай моладзі выпаў складаны перыяд грамадскага развіцця. Але яна пачынае свой жыццёвы шлях не з чыстай старонкі. Ад старэйшага пакалення ўзята імкненне актыўна ўдзельнічаць у барацьбе за камуністычныя ідэалы. Адна з форм такога ўдзелу — студэнцкія будаўнічыя атрады. Штогод студэнты БДУ, выязджаючы на будоўлі Беларусі, Казахстана, Сібіры, у ГДР, нясуць з сабой перадавую ленінскую думку.

Ва універсітэце многа добрых традыцый і карысных спраў. Для кожнага знойдзецца справа па душы. Цяперашнія студэнты працягваюць традыцыі камсамольцаў 30-х гадоў, якія вялі значную работу сярод насельніцтва Дзяржынскага і Мінскага раёнаў па прапагандзе тэарэтычнай спадчыны У. І. Леніна. Увайшлі ў традыцыю студэнцкія рытуалы: святы факультэтаў, студэнцкая тэатральная вясна, пасвячэнне ў студэнты, апошні званок, медыум, злёты, вечары дружбы савецкіх і замежных студэнтаў.

Ва універсітэце працуюць 65 студэнцкіх навуковых гурткоў, у якіх займаюцца каля 2.300 студэнтаў, студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі. Ёсць дзе паспрабаваць свае сілы!

Моладзь і старэйшае пакаленне нашага народа рыхтуюцца ўрачыста адзначыць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна. Асаблівая адказнасць ляжыць на камсамольскай арганізацыі нашага універсітэта, які носіць імя У. І. Леніна. Кожная старонка гісторыі камсамольскай арганізацыі звязана з імем тых, хто стаяў на чале арганізацыі, хто сваёй энергіяй, справамі натхняў студэнцкую моладзь на вялікія здзяйсненні. Мы павінны ўнесці свой уклад у развіццё добрых традыцый.

**У. НАУМЧЫК,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.**




## ГОРАЧА ВІНШУЕМ З ПАЧАТКАМ НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА!

## БУДЗЬЦЕ ДАСТОЙНЫМІ!

Кожны год 1 верасня асабліва ўрачысты і хвалюючы дзень. Гэта і свята, і захапляючая праца. Дзень новых знаёмстваў і непасрэднага далучэння да навукі шматтысячнай студэнцкай арміі.

Сёння будучыя фізікі і матэматыкі, юрысты і філолагі, біёлагі і хімікі, гісторыкі і журналісты робяць свой першы крок у новым навучальным годзе, асабліваcцю якога з'яўляецца падрыхтоўка да ленінскага юбілею.

Дата, якую адзначыць увесь свет, асабліва дарагая нам, савецкім людзям. Усе нашы дасягненні ў будаўніцтве сацыялізма і камунізма, небывалы росквіт шматнацыянальнай культуры, выдатныя навуковыя перамогі авеяны ленінскім геніем.

Іменна дзякуючы Ільічу вы, маладое пакаленне ленінскай рэвалюцыйнай арміі, сыны, унукі адважных абаронцаў сваёй сацыялістычнай Радзімы, прыйшлі сёння ў цудоўныя універсітэцкія аўдыторыі і лабараторыі, забяспечаныя навейшым абсталяваннем, каштоўнасць якога вылічваецца мільёнамі рублёў. Вы пасяліліся ў добраўпарадкаваных інтэрнатах, да вашых паслуг прадастаўлены багацейшыя бібліятэкі, вас павядуць дарогамі ведаў таленавітыя выкладчыкі, выдатныя вучоныя. Гэтыя цудоўныя ўмовы і магчымасці кожны студэнт павінен выкарыстоўваць у поўнай меры і адказаць на вялікія бацькоўскія клопаты аб сабе добрай вучобай, актыўнай грамадскай і навуковай дзейнасцю.

Ва універсітэт паступаюць безумоўна здольныя людзі. Ад іх чакаюць глыбокага засваення праграмнага матэрыялу, творчых адносін да вывучаемых дысцыплін.

Універсітэт ганарыцца сваімі маладымі вынаходнікамі-фізікамі, таленавітымі даследчыкамі з гістарычнага, філалагічнага, хімічнага і іншых факультэтаў, сваімі выдатнымі спартсменамі. Ленінскія і імянныя стыпендыяты — залатое ядро нашага калектыву. На іх павінны раўняцца, пераймаць у іх рацыянальныя метады работы, умелую арганізацыю свайго працоўнага дня ўсе студэнты.

Прыналежнасць да універсітэта абавязвае быць не толькі добрым студэнтам, але і актыўным прапагандыстам навукі, прадаўжальнікам лепшых традыцый, падмурак якіх закладвалі барацьбіты з непісьменнасцю, пакарыцелі цаліны, удзельнікі паходаў па месцах баявой і працоўнай славы нашага народа, будаўнікі студэнцкіх атрадаў.

Напружаная самастойная работа з першых жа дзён, добрасумленныя адносіны да семінарскіх і практычных заняткаў дазволяць хутка ўвайсці ў рытм студэнцкага жыцця, дапамогуць паўней раскрыць таленты і здольнасці кожнага. І тады яшчэ больш значнымі будуць поспехі роднага універсітэта, які носіць імя вялікага Леніна.

Высока трымайце гонар універсітэта, будзьце дастойнымі яго выхаванцамі!

**С. УМРЭЙКА,**
**прарэктар па вучэбнай рабоце, член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук СССР.**

## ДОБРАГА ПАЧАТКУ!

Першага верасня больш 2000 юнакоў і дзяўчат упершыню прыйдуць у аўдыторыі і кабінеты нашага універсітэта, каб на працягу пяці напружаных студэнцкіх год авалодваць сакрэтамі выбранай спецыяльнасці. Але будучым педагогам, работнікам народнай гаспадаркі, камандзірам вытворчасці, акрамя цвёрдых спецыяльных ведаў, патрэбна ідэйная загартоўка, вопыт арганізатарскай і выхаваўчай работы ў масах. Гэты вопыт нашы студэнты набываюць, прымаючы ўдзел у рабоце прафсаюзнай, камсамольскай і іншых студэнцкіх арганізацый.

У. І. Ленін назваў прафсаюзы школай камунізма. І гэта сапраўды так. Возьмем, да прыкладу, прафсаюзную студэнцкую групу. Многа задач узнікае ў яе рабоце. І яна арганізуе моладзь, вучыць у паўсядзённых справах чэрпаць крупінкі вопыту камуністычнага будаўніцтва.

Праца студэнтаў — гэта ўпартая барацьба за веды. І прафсаюзны, камсамольскі актыў групы павінен пастаянна клапаціцца аб паляпшэнні паспяховасці, дабівацца самастойна або праз вышэйстаячыя прафсаюзныя органы паляпшэння ўмоў падрыхтоўкі да заняткаў, аказваць непасрэдную дапамогу адстаючым.

З поля зроку групы не павінны выпадаць і пытанні быту. У шасці інтэрнатах універсітэта жыве звыш 3 тысяч чалавек, аднак забяспечаны жыллём яшчэ далёка не ўсе. Таму іменна ў групе павінны вырашацца пытанні: каму ў першую чаргу неабходна выдзеліць месца ў інтэрнаце, каму дапамагчы адшукаць кватэру, каму аказаць матэрыяльную дапамогу з фонду прафарганізацыі і рэктарата.

Прафсаюзныя арганізацыі клапоцяцца і аб цікавым адпачынку. Тут і студэнцкія вечары, і сумеснае наведванне тэатраў, кіно, нядзельныя экскурсіі і лыжныя прагулкі, дыспуты і сустрэчы.

Студэнты універсітэта карыстаюцца льготнымі пуцёўкамі ў дамы адпачынку і санаторыі. Толькі ў прафілакторыі вну штомесяц адпачываюць 70—80 чалавек. Пытанне, хто мае найбольшую патрэбу ў пуцёўцы, павінна вырашаць таксама прафсаюзная група.

Безумоўна, тут пералічана толькі невялікая частка тых спраў, вырашаць якія прыйдзецца самім студэнтам.

З пачаткам заняткаў пачынаецца арганізацыйна-выбарчая кампанія. Да яе трэба аднесціся самым сур'ёзным чынам. Студэнцкі ж перыяд лічаць лепшым у жыцці. І першы крок па гэтым шляху — выбары дастойных важакоў прафсаюзных і камсамольскіх груп.

**Л. САБАЛЕЎСКІ,**
старшыня прафсаюзнага камітэта.

## САРДЭЧНАЕ ДЗЯКУЙ!

**Сёння, радуючыся разам з усімі, каму выпала вялікае шчасце быць студэнтам універсітэта, мы з вялікай удзячнасцю ўспамінаем нашых настаўнікаў. Гэта яны праводзілі нас у нялёгкі шлях, гэта яны гартавалі наш поспех.**

**Адразу ж, з восьмага класа, калі фізіку пачала выкладаць Таццяна Якаўлеўна Рудкоўская, у нас і з'явілася любоў да гэтага прадмета. Надоўга застануцца ў памяці яе цікавыя, можа нават нялёгкія, але заўсёды зразумелыя ўрокі. Яна не шкадавала ні сіл, ні часу, каб перадаць нам свае багатыя веды. І не толькі веды. Ад Таццяны Якаўлеўны мы пераймалі нешта большае — любоў да прадмета. Нават у нялёгкія для нас гадзіны смутку і расчаравання, калі ў мінулым годзе пры паступленні ва універсітэт нам не ўдалося прайсці па конкурсу, наша настаўніца падтрымала нас, у патрэбны момант не дала магчымасці страціць веру ў свае сілы.**

**Пасля школы, ужо працуючы на вытворчасці, мы не кідалі падручнікаў. Паступілі на падрыхтоўчыя курсы. Выкладчыкі БДУ таксама не шкадавалі сваёй энергіі, каб даць нам патрэбныя веды, і за гэта ім сёння вялікае дзякуй.**

**Асабіста нам вельмі хочацца падзякаваць Феадосіі Ціханаўне Нячай, якая вельмі цікава і змястоўна праводзіла заняткі па раздзелу механікі.**

**Год прайшоў не дарэмна. Сёлета атрымалі па 14 балаў, і мы — студэнты!**

**А. КІРЫЛЕНКА,**
**М. ГАЙКОЎ,**
**выпускнікі Рогінскай сярэдняй школы Буда-Кашалёўскага раёна, студэнты І курса аддзялення радыёфізікі і электронікі.**

# ЗАЛАТЫ КЛЮЧЫК—ВЕДЫ

У першы дзень экзаменаў у сем гадзін раніцы старшыня прыёмнай камісіі І. І. Трухан у каторы ўжо раз праверыў у дэталях гатоўнасць універсітэта гасцінна сустрэць шматтысячную армію паступаючых. Рэктарат і партком паклапаціліся аб тым, каб уступныя экзамены прайшлі на самым высокім узроўні: выдзелены лепшыя, прасторныя і сонечныя аўдыторыі, падрыхтаваны табліцы, карты, наглядныя дапаможнікі.

...Стрэлка гадзінніка набліжаецца да 9-ці, вось-вось пачнецца пісьмовы экзамен па рускай мове і літаратуры, возьмуць білеты першыя, хто экзаменуецца па геаграфіі, біялогіі, фізіцы, гісторыі, замежнай мове. І ў гэты час раптам заўважаецца, што нехта з абітурыентаў забыўся дома экзаменацыйны ліст. Залiваючыся слязамі, цёмнавалосая дзяўчына расказвае, што сяброўка нечакана забрала з сабой яе экзаменацыйныя дакументы. І прыёмная камісія тэрмінова прымае меры хуткай дапамогі.

У студэнцкім гарадку наступае нейкая затоеная цішыня.

У адной з самых вялікіх аўдыторый галоўнага корпуса падрыхтаваліся пісаць сачыненне абітурыенты філалагічнага факультэта. Тут прысутнічае міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР Н. М. Мяшкоў і намеснік упраўлення вну С. Н. Чарноў.

Цяпер чытаеш на ўсіх тварах нясцерпнае жаданне: якія ж тэмы там, у запячатаным канверце, які трымае ў руках экзаменатар? Нарэшце:

— Паслухайце ўважліва. Першая тэма: «Народны бунт у адлюстраванні А. С. Пушкіна», другая — «Ленін і цяпер жывей за ўсіх жывых». Гул адабрэння пракочваецца па аўдыторыі. Тэма яўна падабаецца. І трэцяя— «Абарона сацыялізма — інтэрнацыянальны абавязак камуністаў».

Пакуль будучыя філолагі абдумваюць тэмы, прыкідваюць план работы, мы заглянем да абітурыентаў геаграфічнага факультэта. Вось хоць бы у 51 аўдыторыю біялагічнага корпуса. Тут вядуць экзамен дацэнты Віктар Якаўлевіч Крышчановіч і Уладзімір Анатольевіч Навіцкі.

Цікавімся, як падрыхтаваны цяперашнія кандыдаты ў студэнты.

— Адказваюць добра. Ці ёсць медалісты? Так, адзінаццаць чалавек. Менш, чым у мінулым годзе, але веды паказваюць выдатныя.

У ведамасці, у графе «адзнака» прыемны стоўбік з пяцёрак і чацвёрак. Нават супраць трынаццатага білета пяцёрка!

Адказвае Ларыса Марцінкевіч з Лагойскага раёна, выпускніца Янушкавіцкай сярэдняй школы. Ларыса медалістка. Выдатна закончыла яшчэ і педагагічнае вучылішча.

Грунтоўна асвятляе дзяўчына першае пытанне білета. Правільна характарызуе асноўныя зернявыя культуры ў СССР, добра працуе з картай. Не выклікаюць цяжкасцей і дадатковыя пытанні аб сталіцах дзяржаў, палітычным ладзе. Яна хутка знаходзіць на карце патрэбныя раёны, гарады, нізіны. Пяцёрка ставіцца аднадушна і з задавальненнем.

Цяпер уся ўвага чарговаму абітурыенту Георгію Каранеўскаму. Ён просіць дазволу пачаць з другога пытання — «Асноўныя раёны чорнай металургіі СССР». Пярэчанняў няма. Пачатак не паказвае пакуль што нічога дрэннага. Правільна названы некаторыя буйнейшыя раёны, а вось астатнія ўспамінаюцца з цяжкасцю, пасля наводзячых пытанняў. Зусім забыт Кузбас. Каранеўскі не можа назваць гэты прамысловы цэнтр нават пасля дастаткова празрыстых намёкаў экзаменатараў.

Не змог адказаць Г. Каранеўскі на першае пытанне білета і на шэраг дадатковых.

Ацэнка і тут была аднадушнай — тройка...

Паверхам ніжэй экзаменуюцца абітурыенты біяфака, групы 38, 39, 40.

Да 13 гадзін у 39 групе выстаўлена ўжо 12 адзнак: шэсць выдатных, шэсць добрых. За сталом перад экзаменатарамі кандыдатамі навук Г. В. Гладкім і А. В. Лёшынай Сяргей Матусевіч, выпускнік 1968 года. Закончыў школу № 42 у Мінску, год працаваў лабарантам. Крыху заўважальна хвалюючыся, Сяргей расказвае аб водарасцях, аб цудоўных уласцівасцях хларэлы і перспектывах яе выкарыстання ў сувязі з касмічнымі палётамі. Вычарпальны адказ дае ён і на другое пытанне, аналізуючы навуковыя гіпотэзы ўзнікнення арганічнага свету.

— Што больш цікавіць у біялогіі? — пытае экзаменатар.

— Біяхімія.

У аўдыторыях гучалі руская, беларуская і нават украінская мовы. Адной абітурыентцы лягчэй аказалася выкласці свае веды па-украінску. І яе зразумелі. Адзнака — добрая.

Змянялі адзін другога хвалюючыя, напружаныя дні. Моладзь, пераступіўшая парог універсітэта, выдатнымі ведамі заваёўвала права быць яго студэнтамі.

А. АЛЯКСЕЕВА.

НА ЗДЫМКУ: экзаменуючыя групу медалістаў кандыдаты біялагічных навук В. С. Анохіна і Ю. С. Патаенка ставяць чарговую выдатную адзнаку. Яе атрымлівае Людміла Чарняк.

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.






# НІ ПУХУ, НІ ПЕР'Я!

Здаецца, зусім нядаўна віселі на дзвярах універсітэцкіх аўдыторый таблічкі з перасцерагаючым надпісам: «Цішэй! Ідуць экзамены!» Прахадзілі заклапочаныя абітурыенты, паўтараючы на хаду якую-небудзь формулу або стараючыся не пераблытаць паслядоўнасць тых ці іншых гістарычных падзей... А цяпер гэта ўжо пройдзены этап. Нехта ўжо лічыць сябе паўнапраўным студэнтам, а некаму прыйдзецца яшчэ раз спрабаваць свае сілы, яшчэ раз адчуць трывожныя экзаменацыйныя хваляванні.

Сёлета ў 16-тысячны студэнцкі калектыў БДУ прыйшло яшчэ 2250 новых членаў: гісторыкі і юрысты, фізікі і географы, матэматыкі і хімікі, філолагі і біёлагі. І сярод іх 75 будучых журналістаў. Вядома, на агульным колькасным фоне 75— лічба не вельмі ўнушальная, але ў маштабах факультэта — гэта важкая велічыня. Што сапраўды дасць гэта 75, мы даведаемся праз пяць год, калі ў агульны паток журналісцкіх кадраў увальецца яшчэ адзін жывы ручаёк сабкораў і спецкораў.

Праўда, многія з іх яшчэ да паступлення ў вну спрабавалі свае сілы ў друку: змяшчалі на старонках газет заметкі, артыкулы, апавяданні, нарысы, былі няштатнымі карэспандэнтамі раённых і гарадскіх выданняў. Гэта А. Елісееў, Л. Екель, Ю. Паўлёнак, Г. Стома, В. Жук, Н. Сінкевіч, Т. Вашчанка і многія іншыя. А некаторыя маюць ужо пэўны стаж практычнай работы. Т. Федарцова — літсупрацоўнік райгазеты «Маяк Палесся», М. Арлоў—«Дзвінскай праўды», Д. Лупач — фотакор «Зары над Нёманам», Т. Чарняўская —старшы літсупрацоўнік даўгаўпілскай газеты «Авангард».

Заселены студэнцкія інтэрнаты, шматлікія аўдыторыі прымаюць сваіх старых і новых знаёмых. Поспехаў вам, дарагія сябры, у новым навучальным годзе! Ні пуху, ні пер'я!

Т. ХАРЭЎСКАЯ, студэнтка.

Для Ларысы Співак хваляванні засталіся ззаду. Экзамены здадзены паспяхова. Цяпер можна пачытаць газету. Студэнтцы-журналістцы не абыякава, аб чым расказвае «Беларускі універсітэт».

Фота М. Нечыпарэнкі.

## АДБУДЗЕЦЦА Ў ВЕРАСНІ

● Прайшлі напружаныя дні працоўнага лета. Наперадзе трэці этап ленінскага заліку. У планах камсамольскай арганізацыі прадугледжана многа разнастайных карысных спраў. Так, з 5 верасня пачне работу 8-дзённы семінар камсамольскага актыву, на якім будуць разгледжаны пытанні ідэйнага выхавання студэнтаў, вучэбнай і выхаваўчай работы ў камсамольскіх арганізацыях.

● У канцы верасня адбудзецца злёт студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэта, на якім будуць падведзены вынікі трэцяга працоўнага семестра.

# ПЛЮСЫ І МІНУСЫ ПАДРЫХТОЎКІ

Складаная і адказная задача стаяла ў гэтым годзе перад экзаменатарамі прадметнай камісіі рускай мовы і літаратуры. З некалькіх тысяч абітурыентаў, якія паступалі ў старэйшую навучальную ўстанову рэспублікі, неабходна было адабраць найбольш пісьменных, добра валодаючых літаратурнай мовай будучых студэнтаў.

У ходзе экзаменаў выявіліся як моцныя, так і слабыя бакі падрыхтоўкі абітурыентаў, а разам з тым і становішча спраў у выкладанні рускай мовы і літаратуры ў некаторых школах рэспублікі.

Сачыненне па рускай мове і літаратуры, як правіла, пішуць усе абітурыенты. Прыемна адзначыць, што гэты экзамен не стаў каменем спатыкнення для большасці з іх.

Аднак найбольш распаўсюджанай застаецца адзнака тры; чацвёркі параней шаму ў колькаснай меншасці, а работы, якія заслугоўваюць адзнакі пяць, можна пералічыць па пальцах. Ужо гэтыя факты гавораць аб тым, што пісьменнасць выпускнікоў сярэдніх школ пакідае жадаць лепшага, і гэтае пытанне патрабуе не столькі пастаноўкі, колькі энергічнага рашэння.

У сваіх сачыненнях абітурыенты паказваюць добрыя веды літаратурнага матэрыялу, уменне лагічна думаць, праводзіць паралелі і аналогіі, рабіць самастойныя вывады і абагульненні. І дастаткова часта сачыненне з пункту гледжання ведаў па літаратуры поўнасцю заслугоўвае добрай адзнакі, але тры-чатыры грубыя граматычныя памылкі не дазваляюць экзаменатару паставіць добрую адзнаку. Да ліку больш распаўсюджаных адносяцца памылкі на правапіс падвойных зычных на граніцы прыстаўкі і кораня, няправільнае напісанне адмоўя НЕ з дзеясловам, ненаціскных злучальных галосных, няправільнае ўжыванне вялікіх літар пры напісанні назваў гістарычных падзей, рэвалюцыйных свят, палітычных партый, адвольнае дзяленне на склады пры пераносе слоў, шматлікія скажэнні ўласных імён замежнага паходжання і іншыя.

Не ўсё гладка ў сачыненнях і з пункту гледжання ведаў па літаратуры. У гэтым годзе абітурыентам прапаноўваліся тэмы сачыненняў, непасрэдна звязаныя з імем У. І. Леніна. Паэма У. У. Маякоўскага «Уладзімір Ільіч Ленін», нарыс А. М. Горкага аб Леніне, «Сіні сшытак» Э. Казакевіча і іншыя творы рускай савецкай літаратуры аб правадыру сусветнага пралетарыяту шырока вядомы нашай моладзі і любімы ёю.

Але, на жаль, гаворачы аб вобразе У. І. Леніна ў савецкай літаратуры, абітурыенты больш ахвотна асвятляюць асабістыя, чалавечыя якасці Ільіча. Ленін «просты, як праўда», ён вельмі добры, гэта «самы чалавечны чалавек», «ён, як вы і я зусім такі ж»... Выбіраючы гэтыя цытаты з нарыса А. М. Горкага і паэмы У. У. Маякоўскага, выпускнікі школ, самі таго не ўсведамляючы, парушаюць непадзельнае адзінства ў асвятленні вобраза Леніна не толькі як чалавека, але і дзяржаўнага дзеяча, палітычнага правадыра. Цяжка і не патрэбна спрачацца са сцвярджэннямі, што У. І. Ленін быў добрым і простым. Але гэта не дае нам права забываць аб палітычнай непрымірымасці і прынцыповасці правадыра ў перыяд грамадзянскай вайны, інтэрвенцыі, белагвардзейскіх загавораў. Гэта не дае нам права штучна прыніжаць вобраз Леніна глыбока памылковымі сцвярджэннямі аб незвычайнай прастаце і дабраце гэтага магутнага тытана думкі.

Напрашваецца вывад, што настаўнікі рускай мовы і літаратуры ў старэйшых класах пры тлумачэнні гэтай тэмы недастаткова дакладна адцяняюць непарушную партыйную прынцыповасць правадыра, яго веліч і геніяльнасць, бескампраміснасць у пытаннях ідэалогіі.

Свае радасці і засмучэнні прынеслі і вусныя экзамены па рускай мове і літаратуры. Несумненна, узровень ведаў па гэтаму прадмету дастаткова высокі. Да прыемных з'яў патрэбна аднесці і тое, што абітурыенты з сельскай мясцовасці добра валодаюць рускай мовай, валодаюць трывалымі ведамі праграмнага матэрыялу. Рэзкага кантрасту ў ведах выпускнікоў гарадскіх і сельскіх школ не заўважаецца. Найбольш паспяховымі ў большасці выпадкаў былі адказы на пытанні, звязаныя непасрэдна са зместам мастацкіх твораў. І ўсё ж веданне рускай класічнай літаратуры не заўсёды задавальняла экзаменатараў. Амаль поўную бездапаможнасць праяўлялі абітурыенты, сутыкаючыся з такімі пытаннямі, як асноўныя размеры вершаскладання, моўныя выяўленчыя сродкі мастацкага слова, паняцці іроніі, сатыры, гумару, эпасу, лірыкі і драмы.

Так, напрыклад, абітурыентка Галіна С., выпускніца адной са школ Івацэвіцкага раёна, адносіла да ліку эпітэтаў кожны прыметнік, які сустракаецца ў тэксце. Нічога пераканаўчага не магла яна сказаць і аб змесце паняцця эпас, зводзячы яго да былін і пагаворак.

Праграмы сярэдняй школы прадугледжваюць знаёмства вучняў з асновамі савецкага літаратуразнаўства, аднак якасць ведаў па гэтаму матэрыялу параней шаму застаецца нізкай.

Недастаткова глыбока засвайваюцца вучнямі сярэдняй школы артыкулы У. І. Леніна аб літаратуры, у прыватнасці, артыкул «Партыйная арганізацыя і партыйная літаратура». Своеасаблівую і ў выніку няправільную трактоўку даюць нярэдка абітурыенты артыкулу У. І. Леніна «Л. М. Талстой». Як правіла, гаворачы аб метадзе сацыялістычнага рэалізму, паступаючыя блытаюцца, не могуць даць дакладнага азначэння, збіваюцца на агульныя фразы.

Некалькі разоў прапаноўвалася абітурыентам прааналізаваць адзін з твораў

## *Для вас, першакурснікі*

# АКІЯН ЧАЛАВЕЧАЙ МУДРАСЦІ

З ранняга ўзросту і да апошніх дзён сваіх чалавек карыстаецца кнігамі як невычэрпнай крыніцай ведаў, бязмежным акіянам чалавечай мудрасці. З сягоняшняга дня вы — студэнты! І ўся скарбніца універсітэцкай бібліятэкі — да вашых паслуг. Але перш за ўсё вы павінны пазнаёміцца з самой бібліятэкай. Яна — адна з буйнейшых бібліятэк вну рэспублікі. З дастатковай паўнатой у яе фондзе прадстаўлены грамадска-палітычная літаратура, шматлікія работы па матэматыцы і прыродазнаўчых навуках, мовазнаўству, літаратуразнаўству, гістарычных і юрыдычных навуках, руская, беларуская і зарубежная мастацкая літаратура.

Бібліятэка мае ў наяўнасці шырокі даведніцкі фонд. Замежны аддзел уключае навуковую і мастацкую літаратуру на розных мовах. За многія дзесяцігоддзі сабрана руская і зарубежная перыёдыка.

Несумненную цікавасць уяўляюць перыядычныя і серыйныя выданні акадэмій, навуковых таварыстваў і вышэйшых навучальных устаноў. Каля дзесяці тысяч тамоў утрымлівае рэдкі фонд. Важную частку складаюць падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па прафіліруючых ва універсітэце навуках.

У цяперашні час наш кніжны фонд набліжаецца да аднаго мільёна тамоў. Штогод у бібліятэку паступае звыш 50 тысяч тамоў кніг, брашур і часопісаў. 35—40 працэнтаў усіх паступленняў складаюць падручнікі і вучэбныя дапаможнікі. Уменне арыентавацца ў гэтым бясконцым патоку літаратуры — адна з важнейшых умоў паспяховай работы, вучобы і навуковай творчасці.

У першым семестры навучальнага года супрацоўнікі бібліятэкі праводзяць заняткі са студэнтамі першага курса, на якіх расказваецца аб бібліятэцы, правілах карыстання ёю, культуры чытання, каталогах, картатэках, даведніках і бібліяграфічных указальніках, якія могуць служыць пуцяводцамі па кніжных паліцах.

Запіс чытачоў у бібліятэку праводзіцца на дамашнім абанеменце (галоўны корпус, другі паверх). Тут жа выдаецца адзіны білет чытача, па якому студэнт можа карыстацца літаратурай ва ўсіх месцах абслугоўвання. Білет чытача з'яўляецца пасведчаннем асобы таго, хто карыстаецца бібліятэкай, і ён не павінен перадавацца другой асобе. Пры запісе ў бібліятэку студэнты універсітэта прад'яўляюць студэнцкі білет і фотакартачку. Тыя, хто парушыць правілы, указаныя ў білеце чытача, пазбаўляюцца права карыстання бібліятэкай.

Студэнцкія чытальныя залы размешчаны на другім паверсе (№ 2) і на трэцім (№№ 3, 4).

Чытальныя залы маюць свой падсобны фонд з адкрытым доступам. Гэта дазваляе студэнтам непасрэдна ля кніжнай паліцы пазнаёміцца з літаратурай. Пры самастойных пошуках чытач заўсёды можа атрымаць кансультацыю і дапамогу дзяжурнага бібліятэкара.

Выносіць кнігі з чытальнай залы строга забараняецца.

Чытач мае магчымасць атрымліваць кнігі з падсобных фондаў абанемента і чытальных залаў па вуснаму патрабаванню і пісьмоваму — з асноўнага кнігасховішча. Для гэтага патрэбна акуратна і правільна запоўніць бланкі патрабаванняў чытачоў. Пункты прыёму патрабаванняў знаходзяцца ў чытальных залах і абанеменце.

Вялікую дапамогу ў падборы літаратуры аказваюць бібліятэчныя каталогі і картатэкі. Бібліятэка універсітэта мае два тыпы каталогаў: алфавітны і сістэматычны. У алфавітным каталогу картачкі расстаўляюцца ў парадку прозвішчаў аўтараў, загалоўкаў твораў друку (калі аўтар не ўказан або аўтараў больш трох), назваў устаноў, арганізацый, ад імя якіх выдаюцца тыя ці іншыя матэрыялы (так званы калектыўны аўтар). Да алфавітнага каталога звяртаюцца ў тым выпадку, калі чытачу вядомы аўтар кнігі або назва.

У нашай бібліятэцы некалькі алфавітных каталогаў, важнейшыя з якіх: алфавітны генеральны каталог (трэці паверх, пакой 317), які адлюстроўвае кніжны фонд з вычарпальнай паўнатой (асобна на рускай і беларускай мовах); алфавітны каталог кніжнага фонду студэнцкіх чытальных залаў; алфавітны каталог, які расказвае аб паступленні кніг з 1962 года (другі паверх, дамашні абанемент).

Пры падборы літаратуры **па асобнай тэме** неабходна звяртацца да сістэматычнага каталога, у якім картачкі на друкаваныя творы размяшчаюцца па асобных галінах ведаў. Сістэматычным каталогам лягчэй карыстацца, калі звяртацца да алфавітна-прадметнага ўказальніка, які знаходзіцца на другім паверсе (п. 223, у памяшканні даведніцка-бібліяграфічнага аддзела).

Даведніцка - бібліяграфічны аддзел здзяйсняе інфармацыйна - бібліяграфічныя функцыі, дае кансультацыі па пытаннях методыкі самастойных пошукаў літаратуры, аказвае дапамогу чытачам пры адшукванні неабходнай літаратуры. У аддзеле ёсць добра распрацаваная сістэматычна-прадметная краязнаўчая картатэка літаратуры аб Беларускай ССР. Акрамя краязнаўчай картатэкі, да паслуг чытача прадастаўлен шэраг іншых картатэк, у тым ліку сістэматычная картатэка часопісных артыкулаў, якая вядзецца з 1952 года.

Вялікае месца ў абслугоўванні студэнтаў юрыдычнага факультэта займае бібліятэка гэтага факультэта, якая знаходзіцца ў корпусе філалагічнага факультэта па вуліцы Чырвонаармейскай, д. № 6. Яна ўкамплектавана вучэбнай і часткова навуковай літаратурай па праграмах факультэта.

Амаль на ўсіх факультэтах ёсць кафедральныя бібліятэкі, укамплектаваныя адпаведнай іх профілю літаратурай. Найбольш дэфіцытныя падручнікі кафедры самі размяркоўваюць у студэнцкіх групах.

З кабінетаў, як і з чытальных залаў, выносіць літаратуру нельга.

Ва ўсіх аддзелах, чытальных залах і абанеменце можна пазнаёміцца з новымі паступленнямі кніг і часопісаў, убачыць тэматычныя выстаўкі. Аб'явы запрашаюць вас прыняць удзел у аглядах, літаратурных вечарах, дыспутах.

Для азнаямлення з бібліятэкай, каталогамі і работай чытальных залаў са студэнтамі першых курсаў праводзяцца групавыя экскурсіі.

Пры бібліятэцы працуе савет студэнтаў (студэнцкі бібліятэчны савет). Запрашаем вас прыняць удзел у рабоце савета, быць карэспандэнтамі сценгазеты «Голас чытача», уносіць свае прапановы ў рабоце бібліятэкі, прымаць актыўны ўдзел у масавых мерапрыемствах.

Будзьце сябрамі бібліятэкі, любіце кнігу і шануйце яе. Паспяховай вам вучобы!

**Р. ЛЮБІНА,**
**дырэктар бібліятэкі.**

# ЗАЎСЁДЫ Ў ПАМЯЦІ

**У дні святкавання 25-годдзя з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў па ўсёй рэспубліцы прайшлі вялікія ўрачыстасці. Памяць аб героях, якія загінулі ў барацьбе з лютым ворагам, свята ўшаноўваецца.**

**НА ЗДЫМКАХ: (уверсе) ля мемарыяльнага комплексу ў Хатыні; (унізе) урачыстасці на мінскім стадыёне «Дынама»; (ніжэй) у святочнай калоне ветэраны вайны.**

**Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.**








## *НЕ ЗГАСНУЦЬ ПОДЗВІГІ БАЦЬКОЎ*

*У час летняй студэнцкай практыкі адбыліся канферэнцыі чытачоў, прысвечаныя 25-годдзю вызвалення Савецкай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Загадчык аддзела бібліятэкі А. М. Рукшын забяспечыў студэнтаў кнігамі, дапамагаў парадамі. Канферэнцыі на тэмы «Беларусь-партызанка» і «Вобраз савецкага воіна ў гады Вялікай Айчыннай вайны» вёў удзельнік баёў за Берлін дацэнт філалагічнага факультэта У. С. Карабан.*

*Студэнты П. Шупляк, Е. Багдановіч, І. Лісоўскі, Н. Салавей прааналізавалі творы Я. Купалы, Я. Коласа ваенных гадоў, І. Новікава «Руіны страляюць ва ўпор», «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску» і іншых пісьменнікаў, паказалі велічны подзвіг беларускага народа, братэрскую дружбу і адзінства ўсіх народаў Савецкага Саюза.*

*Ю. Цыркуноў, Е. Ціткоў, А. Кракаў, А. Цывес, Ю. Шыкло, гаворачы аб вобразе савецкага воіна, спынілі ўвагу на творах «Фронт» Карнейчука, «Маладая гвардыя» Фадзеева, «Нашэсце» Ляонава, «Жывыя і мёртныя», «Салдатамі не нараджаюцца» Сіманава, «Трэцяя ракета» Быкава і іншых, паказалі ролю і месца савецкай літаратуры ў жыцці нашага грамадства.*

*Ваенна-патрыятычная тэма заўсёды выклікае зацікаўленасць у чытача, прымушае яго задумацца над лёсам герояў, абуджае высокія грамадзянскія пачуцці.*

*М. САЛАВЕЙ,*
*студэнт IV курса журфака.*

## *НАТАТКІ ЭКЗАМЕНАТАРА*

**сучаснай савецкай літаратуры. Большасць з іх зараз жа пачынала гаварыць аб «Узнятай цаліне» М. А. Шолахава.**

**«Узнятая цаліна» — выдатны твор, аднак патрэбна ўлічваць час напісання гэтай кнігі. За апошнія гады ў літаратуру прыйшло многа таленавітай моладзі, выпусцілі свае новыя кнігі пісьменнікі старэйшага пакалення. На жаль, аб новых кнігах Б. Палявога, М. Аляксеева, Ю. Бондарава, аб творчасці В. Цітова і Д. Граніна некаторыя абітурыенты нават і не чулі.**

**Паэтам пашанцавала крыху больш. Моладзь любіць і чытае вершы, але на прапанову прачытаць любімы верш напамяць многія адказваюцца, хоць і могуць пералічыць больш дзесяці імён паэтаў розных пакаленняў. Больш таго, вельмі нешматлікія творы нават са школьнай праграмы ведаюць напамяць.**

**А як можна гаварыць аб анегінскай страфе, не ведаючы напамяць гэтай страфы! Як гаварыць аб мастацкіх асаблівасцях «Вершаў аб савецкім пашпарце», не ўспомніўшы саміх вершаў!**

**Недасканалае веданне паэзіі прыводзіць нярэдка да смешных і сумных вынікаў. Такім прыкладам можа служыць адказ Зоі С., якая закончыла ў 1969 годзе Ждановіцкую сярэднюю школу: янаператварыла верш У. Маякоўскага «Таварышу Нэтэ, параходу і чалавеку» ў «Таварышу Гётэ, пісьменніку і чалавеку».**

**Здараліся выпадкі, калі многія абітурыенты не разумеюць значэння слоў замежнага паходжання, напрыклад, значэння слоў «фаталіст», «нігеліст». Некалькі вучняў не змаглі растлумачыць значэння слова «інтэлігент».**

**Уступныя экзамены закончыліся. Найбольш падрыхтаваныя абітурыенты сталі студэнтамі. Іх радасць зразумелая. Мне думаецца, што разам з імі гэту радасць дзеляць і іх настаўнікі.**

**Б. НІКАНОВІЧ,**
**аспірант кафедры рускай савецкай літаратуры.**



# ЗАПРАШАЕ «КРЫЖАЧОК»

З 1955 года вядзе сваю гісторыю ансамбль танца нашага універсітэта. Калектыў прымаў удзел ва ўсіх аглядах, фестывалях і чатырох дэкадах самадзейнага мастацтва БССР.

У рэпертуары артыстаў-аматараў разнастайныя, у асноўным беларускія народныя танцы, пастаўленыя на самабытным фальклорным матэрыяле, які адлюстроўвае жыццё і быт беларускага народа і развіццё беларускай харэаграфіі. З поспехам выконвае ансамбль і танцы народаў СССР, а таксама краін народнай дэмакратыі.

За гэтыя гады танцоры універсітэта былі частымі гасцямі працаўнікоў горада і сяла не толькі нашай рэспублікі, але і суседніх, выязджалі з канцэртамі ў Рыгу, Тарту, Севастопаль, Калінінград, Казань, Балтыйск і іншыя гарады нашай Радзімы, дзе карысталіся нязменным поспехам. Група ансамбля паспяхова выступала ў Польскай Народнай Рэспубліцы, у Варшаве.

Цяпер наш калектыў рыхтуецца да паездкі ў Германскую Дэмакратычную Рэспубліку.

Памятным для ансамбля быў 1968 год. Паспяхова выступіўшы на аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці рэспублікі, калектыў заваяваў высокае званне — народны ансамбль танца «Крыжачок».

Танцавальны калектыў БДУ — творчае аб'яднанне, на базе якога працуе аддзяленне харэаграфіі факультэта грамадскіх прафесій. Аддзяленне рыхтуе кіраўнікоў танцавальных калектываў.

З 1 верасня 1969 года народны ансамбль танца БДУ праводзіць дадатковы набор юнакоў і дзяўчат з ліку студэнтаў універсітэта.

У разумным адпачынку, у радасным захапленні мастацтвам удзельнікі творчых калектываў чэрпаюць новыя сілы і натхненне для яшчэ больш плённай працы і вучобы. А выступленні перад гледачамі выхоўваюць імкненне да ўдасканалення майстэрства, прывіваюць любоў да цудоўнага савецкага мастацтва.

**М. ЛАПША,**
**мастацкі кіраўнік народнага ансамбля танца «Крыжачок».**

**ПРАЎЛЕННЕ студэнцкага клуба БДУ імя У. І. Леніна аб'яўляе набор у наступныя агульнауніверсітэцкія калектывы мастацкай самадзейнасці:**

НАРОДНЫ АРКЕСТР НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

НАРОДНЫ АНСАМБЛЬ ТАНЦА «КРЫЖАЧОК»

СТУДЭНЦКІ ТЭАТР

ЭСТРАДНЫ АНСАМБЛЬ

ДУХАВЫ АРКЕСТР

ВАКАЛЬНУЮ І ЦЫМБАЛЬНУЮ ГРУПЫ.

**Запісацца ў выбраны вамі калектыў можна ў прафкоме універсітэта (галоўны корпус, пакой 205).**

**ПРАЎЛЕННЕ КЛУБА.**

## ПРЫЕМНА ДАРЫЦЬ РАДАСЦЬ

У кожнага чалавека, акрамя асноўнай прафесіі, ёсць сваё захапленне, якому ён аддае большую частку свабоднага часу.

Я прыйшла ў танцавальны калектыў універсітэта на першым курсе. Спачатку было крыху страшнавата, але пасля прывыкла, паступова ўвайшла ў калектыў, здзіўляюча дружны і вясёлы. Рэпеціраваць даводзілася многа, але стомы не адчувалася. Апладысменты гледачоў гаварылі аб тым, што праца не прайшла дарэмна.

Мы выступалі ў Брэсце, Калінінградзе, Казані. Вельмі цікавымі былі паездкі ў Вільнюс на IV студэнцкае свята песні і танца і ў Харкаў на фестываль універсітэтаў нашай краіны. Цяпер мы рыхтуемся да новай паездкі, а пасля прымем удзел у аглядзе самадзейнага мастацтва, прысвечаным 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна

Кожны год у наш калектыў прыходзяць навічкі, студэнты розных факультэтаў. Спачатку заўсёды бывае цяжка, але як прыемна бачыць усмешкі гледачоў, адчуваць, што мы прыносім ім радасць і добры настрой!

**Т. ЛЕБЕДЗЕВА,**
**салістка народнага ансамбля танца «Крыжачок», студэнтка III курса геафака.**

# НА МЕРЫДЫЯНЕ ЛЕНІНСКАГА ПРАЦОЎНАГА

*Студэнцкая цаліна... Юная яна зусім, але ўжо сёння папулярнасць яе вялікая. Чаму? Відаць, таму, што ў гэтым паняцці зліваюцца разам веліч задач і рэальнасць перспектыў, рамантыка, ад якой захоплівае дыханне, фізічнае адчуванне радасці асабістай працы. І няма нічога здзіўляючага ў тым, што больш 2,5 тысячы юнакоў і дзяўчат з нашага універсітэта выказалі жаданне правесці свае канікулы на будоўлях роднай рэспублікі і любімага Мінска, Казахстана і Сібіры.*

*У сваім дарожным дзённіку я імкнуўся адлюстраваць цікавыя факты з жыцця студэнтаў-будаўнікоў.*



## ЦЯЖКАСЦІ АДОЛЕНЫ

... Той дзень быў для ўсіх мітуслівым і горкім. Працаваць жа прыехалі, а тут адны няўвязкі.

Рабяты шчыльным колам акружылі дырэктара саўгаса. Кожнаму хацелася выказаць усё, што мучыла ў гэтыя дні беспрацоўя. Гаворыць пакуль што Валерый Наважылаў, камандзір атрада. У яго крутыя плечы, упарты лоб, крыху злыя вочы.

— Мне не патрэбны вашы абяцанні, Андрэй Іларыёнавіч. Дайце самае неабходнае: машыны, будаўнічыя матэрыялы.

— Справядлівыя заўвагі. Але пакуль што не можам вырашыць пытанне. Уборка. Самі разумееце...

— Не. Вы абавязаны вырашыць усё цяпер, — парыруе Валерый.

Рабяты падбадзёрвалі камандзіра, выказвалі сваю думку, свае прэтэнзіі.

На наступны дзень на аб'ектах кіпела работа. Машыны адна за другой падвозілі матэрыял, іх разгружалі і адпраўлялі ў паўторныя рэйсы. Рабяты працавалі з поўнай аддачай, неназіраючы за часам. На вачах рос двухпавярховы дом.

...На зямлю апускаўся змрок, прыціх стэп. Толькі зрэдку цішыню парушалі таямнічыя гукі тушканчыкаў-смельчакоў, якія выйшлі пазнаёміцца з загадкавым веліканам, што з'явіўся так раптоўна ў іх уладаннях.

Рабяты вярталіся ў гарадок. І хоць прыйшлося ісці пяшком некалькі кіламетраў, усім было прыемна, бо сёння зрабілі так многа. Спявалі песні, жартавалі. А нейкія два лірыкі жорстка спрачаліся:

— Што добрага ў гэтым стэпе? Ні касагора, ні рва, ні дрэў. Пыл ды жара невыносная. Памерці можна... паэту.

Другі голас не згаджаўся:

— Разумееш, а мне адкрылася непаўторная прыгажосць казахстанскага стэпу: бясконцы казачны зялёны кавёр... высокі кавыль... Які прастор! Колькі зямлі! Колькі спраў можна тварыць на ёй!

...А неба раніцай! Ты назіраў? Яно здзіўляючае, празрыстае. Ні аднаго воблачка. Прыеду, абавязкова прыеду яшчэ.

## ФІЗІКІ—АРТЫСТЫ

Фізікі дыслацыруюцца ў трох пасёлках саўгаса «Ульянаўскі»: Грымячым, Новенькім, Ульянаўскім. Для работы гэта добра: да аб'ектаў — рукой падаць. Для атрадных артыстаў дрэнна: далёка з канцэртамі ездзіць, немагчыма сабрацца для рэпетыцый.



Але ж аэлітаўцы знаходзяць выхад са становішча заўсёды, у любое надвор'е. Так, як сёння... Ідзе праліўны дождж, дарогу так размыла, што здаецца, толькі верталётам можна рызыкнуць недзе вылецець.

Артысты «Аэліты» выехалі на аўтамашыне ГАЗ-59. Прызнацца, гэта крыху горш, чым ляцець на верталёце — кідае з боку ў бок. А хутка яна зусім засела. Камандзір атрада Вадзім Емяльяненка дае каманду:

— Аўрал!.. Да машыны!

Нехта дапаўняе:

— Канцэртмайстры Вуло і Кучынскі — правы борт; тэнары, басы — левы борт!

Усе закасваюць калошы і саскокваюць у гліну, халодную, вязкую. Нібы мураўі, абляпілі выратавальніцу: да пачатку ж канцэрта застаецца ўсяго 30 мінут, а ехаць цэлых 15 кіламетраў.

Віктару Красільнікаву добра: ён танцор і цяпер проста размінаецца, так трэба. А Валодзя Аверкіеў хвалюецца, усіх падганяе. Ён— канферанс'е, яму патрэбна яшчэ паспець там на месцы прагледзець праграму...

Але вось і Грымячы. Усе з палёгкай уздыхнулі. Весяльчак Пеця Юрчанка, саркастычна ўсміхаючыся, раптам пытае:

— А навошта мы машыну піхалі? Прыйшлі ж пяшком.

Коля Баркоўскі папраўляе:

— Не машыну, Пеця, а... канцэрт. Зразумеў?

Усе дружна расмяяліся і пабеглі прама на сцэну — іх чакала перапоўненая зала.

## НЕЗВЫЧАЙНАЯ ЎДЗЯЧНАСЦЬ

Працоўны дзень наблiжаўся да канца. Усе стаміліся, але хацелася закончыць сёння кладку печы для абпальвання цэглы, а заўтра прыступіць да даху. Валерый Яравенка некалькі апярэдзіў сяброў. Ён з асаблівай пяшчотай падняў апошнюю цагліну, асцярожна нанёс на яе тонкі слой раствору і ўрачыста прамовіў:

— Восьмы цуд света! Няўжо я зрабіў цябе?!

Пры гэтым ён далікатна паклаў цагліну на месца і з задавальненнем разагнуў спіну, агледзеўся навокал... Але што гэта? Чорныя клубы дыму падымаліся над вёскай. Няўжо пажар?

Гарэў дом. Непадалёк ад яго стаяў натоўп людзей, але ніхто не рашаўся наблізіцца да вялізных языкоў полымя. Раздумваць было некалі. Анатоль Семянькоў крыкнуў:

— Ваду, лапаты... Хутчэй!

У імгненне вока скінуў з сябе куртку і кінуўся ў вогненны вір. Камандзір атрада «Віхр» Анатоль Панарын і Анатоль Сутулін у гэты час працавалі лапатамі, разам з жыхарамі пасёлка Першамайскі залівалі полымя вадой.

Дваццаць мінут барацьбы з агнём — і пажар прыціх. Жыхары пасёлка горача дзякавалі студэнтам. Дырэктар саўгаса сказаў:

— Я ўзяў бы вас у бой, рабяты.

## ПІЯНЕРЫ, РАЎНЯЙЦЕСЯ!

Калі я ехаў у атрад юрыстаў, быў упэўнены, што мяне чакае сюрпрыз. «Феміда» — пераможца студэнцкай цаліны-68, атрад з багатай гісторыяй. І я не памыліўся.

Вечар 21 ліпеня... Па-святочнаму ўрачыстая невялікая плошча. Навокал людзі: старыя, дзеці, моладзь. Раздаецца каманда:

— Піянеры, раўняйцеся, смірна!

І далей—адточаны рапарт.

Камандзір Аляксандр Найда павіншаваў піянераў, бацькоў са святам — адкрыццём піянерскага лагера ў пасёлку Чапаева.

— Мы, — сказаў Аляксандр,—старанна рыхтаваліся да гэтага дня, з нецярпеннем чакалі яго. Сёння, калі мы прымаем вас, нашы сябры, у свой атрад, запэўніваем: не пашкадуеце.

Ад імя бацькоў выступіў К. Тумаеў. Ён падкрэсліў:

— Нарадзілася добрая традыцыя, якая упэўнена нясе на сваіх крыллях радасць нам, бацькам. Мы даверыем вам сваіх рабят, таму што студэнт — наш цікавы, надзейны сябра...

Пасля ўрачыстай лінейкі запалілі касцёр, адбыўся сумесны канцэрт студэнцкай і піянерскай самадзейнасці.

Цяпер у лагеры 60 дзяцей. Піянерважатая Ліля Шэмет і камісар атрада Зоя Жгун працуюць з дзецьмі штодзённа. Праводзяцца паходы, наладжваюцца спартыўныя ігры на стадыёне, пабудаваным байцамі атрада. Пры лагеры дзейнічае гурток «Умелыя рукі». Але самымі памятнымі падзеямі для піянераў былі збор «Ніхто не забыты, нішто не забыта», паход «Мой родны край», конкурс на лепшы букет кветак.

## ВІКТОРЫЯ — ЗНАЧЫЦЬ ПЕРАМОГА

Рабяты фарсіравалі саман. 10 гадзін пад пякучым сонцам, па калена ў калючым і вязкім растворы. Цяжкая дзеравяная форма, у якую неабходна ўкласці рукамі дваццаць тон масы, роўна столькі ж падняць рукамі і вынесці ва ўстаноўленае месца. Валодзю гэта праца здавалася адскай. Цалінную рамантыку як рукой зняло. «Дадому паеду,— цвёрда сказаў ён. — Не для мяне такая работа...»

Былі розныя меркаванні наконт гэтага. Адны сцвярджалі: «Няхай едзе, калі не можа, тут не курорт «Залатыя дзюны»... Абыдземся...».

Другія не згаджаліся:

— Як паехаць?.. Фізічна здаровы хлопец, таварыш нядрэнны, і раптам — паехаць... Спасаваў, недаацаніў свае магчымасці.

Вырашылі не адпускаць і прапісалі Валодзю калектыўны рэцэпт: часцей, чым іншым, мяняць работу, часам даваць лягчэйшую, часам — цяжэйшую, чым у дні хрышчэння.

— Калі я гляджу, як працуюць мае сябры Фёдар Лазюк, Валодзя Сілін, Ася Паўлюковіч, Анатоль Злотнікаў, мне становіцца сорамна за сябе... — гаворыць Валодзя. Пастараюся быць такім, як яны.

**П. БОНДАР.**
*Мал. В. РУДКІНА.*

**Рэдактар А. НІКОЛЕНКА.**

АТ 18306 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 1357.